Дзяржаўная праграма прыватызацыі зацвярджаецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Кантроль за ажыццяўленнем дзяржаўнай праграмы прыватызацыі ажыццяўляюць Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь і іншыя ўпаўнаважаныя на тое органы.

Артыкул 8. Праграмы прыватызацыі

Праграмы прыватызацыі дзяржаўных аб'ектаў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, зацвярджаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Праграмы прыватызацыі дзяржаўных аб'ектаў, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, зацвярджаюцца мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў.

На падставе праграм органамі прыватызацыі складаюцца пералікі дзяржаўных аб'ектаў, якія падлягаюць прыватызацыі.

Артыкул 9. Органы прыватызацыі, іх функцыі

Пры ажыццяўленні прыватызацыі рэспубліканскай уласнасці інтарэсы дзяржавы як уласніка прадстаўляе і абараняе орган Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю, а аб'ектаў, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, — органы прыватызацыі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

Органы прыватызацыі:

распрацоўваюць праграмы прыватызацыі;

арганізуюць і кантралююць рэалізацыю ўказаных праграм;

ажыццяўляюць кіраўніцтва працэсамі прыватызацыі. У выпадку парушэння заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб прыватызацыі ўзбуджаюць у судовым парадку іскі аб прызнанні незаконнымі прынятых рашэнняў і прыцягненні да адказнасці вінаватых службовых асоб;

ствараюць камісіі па прыватызацыі;

прымаюць рашэнні аб прыватызацыі;

ажыццяўляюць неабходныя пераўтварэнні арганізацыйна-прававых форм дзяржаўных прадпрыемстваў, якія падлягаюць прыватызацыі;

валодаюць пасведчаннямі аб уласнасці на дзяржаўныя прадпрыемствы і маёмасныя долі ў капітале акцыянерных і іншых гаспадарчых таварыстваў у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

выступаюць заснавальнікамі акцыянерных і іншых гаспадарчых таварыстваў;

атрымліваюць дывідэнды, даходы на долі (паі) і выручку ад раздзяржаўлення і прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў і рыхтуюць прапановы аб іх выкарыстанні ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

абменьваюць акцыі дзяржаўных прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь на акцыі юрыдычных асоб іншых дзяржаў і прадпрыемстваў недзяржаўных форм уласнасці;

арганізуюць і праводзяць конкурсы і аўкцыёны па продажу аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці;

ствараюць (ліквідуюць) у сваім складзе адпаведныя фонды для ажыццяўлення функцый валодання і распараджэння дзяржаўнай маёмасцю;

ажыццяўляюць іншыя неабходныя пры прыватызацыі функцыі.

РАЗДЗЕЛ III. БЯЗВЫПЛАТНАЯ ПЕРАДАЧА ЧАСТКІ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАСНАСЦІ

Артыкул 10. Мэта бязвыплатнай перадачы дзяржаўнай уласнасці

Мэтай бязвыплатнай перадачы часткі дзяржаўнай уласнасці толькі грамадзянам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца забеспячэнне сацыяльнай роўнасці ў працэсе прыватызацыі на этапе пераходу да рыначнай эканомікі.

Артыкул 11. Размеркаванне дзяржаўнай уласнасці, якая перадаецца бязвыплатна

Дзяржава ў асобе Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь вызначае (на перыяд бязвыплатнай прыватызацыі) долю дзяржаўнай уласнасці, якая бязвыплатна перадаецца грамадзянам Рэспублікі Беларусь у працэсе прыватызацыі.

Частка дзяржаўнай уласнасці, якая бязвыплатна перадаецца кожнаму грамадзяніну, вызначаецца дзвюма квотамі:

жыллёвай квотай на падставе Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь" і гэтага Закона;

квотай на маёмасць дзяржаўных прадпрыемстваў на падставе гэтага Закона і Закона Рэспублікі Беларусь "Аб імянных прыватызацыйных чэках Рэспублікі Беларусь".

Грамадзянін мае права аб'ядноўваць квоты для іх рэалізацыі ў адпаведнасці з гэтым Законам. У гэтых выпадках для аб'яднання квот выкарыстоўваюцца каэфіцыенты іх эквівалентнага пераводу, якія ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Для рэалізацыі права выкарыстання квот грамадзянамі Рэспублікі Беларусь ім выдаюцца імянныя прыватызацыйныя чэкі "Жыллё", "Маёмасць" у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб імянных прыватызацыйных чэках Рэспублікі Беларусь".

Артыкул 12. Выкарыстанне квот

Квоты ў першую чаргу выкарыстоўваюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь па іх мэтаваму прызначэнню. Стымуляванне выкарыстання квот па мэтаваму прызначэнню праводзіцца дзяржавай на падставе заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Не выкарыстаныя ў працэсе прыватызацыі квоты пагашаюцца дзяржавай.

Артыкул 13. Выкарыстанне жыллёвай квоты

Жыллёвая квота выкарыстоўваецца для прыватызацыі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага і грамадскага жыллёвага фонду.

Пры немагчымасці выкарыстання жыллёвай квоты часткова або поўнасцю па яе мэтаваму прызначэнню яна можа быць накіравана на прыватызацыю маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў у адпаведнасці з гэтым Законам і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб прыватызацыі.

РАЗДЗЕЛ IV. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ МАЁМАСЦІ ДЗЯРЖАЎНЫХ АБ'ЕКТАЎ

Артыкул 14. Прапанова па прыватызацыі

Аб'екты дзяржаўнай уласнасці, якія плануюцца да прыватызацыі, уключаюцца ў пералік аб'ектаў, што прыватызуюцца, як па ініцыятыве органаў прыватызацыі, так і па прапанове працоўных калектываў, фізічных і юрыдычных асоб.

Прапанова павінна змяшчаць:

назву аб'екта, які прапаноўваецца да прыватызацыі;

тэрміны прыватызацыі;

папярэднюю ацэнку кошту аб'екта;

крыніцы сродкаў для выкупу аб'екта;

напрамкі выкарыстання аб'екта пасля яго прыватызацыі;

спіс і паўнамоцтвы асоб, якія прадстаўляюць інтарэсы суб'екта прыватызацыі.

Юрыдычнымі асобамі дадаткова прадстаўляецца натарыяльна завераная копія іх статута.

Прапановы працоўнага калектыву аб уключэнні дзяржаўнага прадпрыемства ў пералік аб'ектаў, якія прыватызуюцца, падаюцца на аснове рашэння вышэйшага органа самакіравання працоўнага калектыву ўпаўнаважанымі на тое гэтым рашэннем асобамі.

Прапанова аб прыватызацыі дзяржаўнага аб'екта падаецца ў орган прыватызацыі па месцы знаходжання аб'екта прыватызацыі.

Артыкул 15. Парадак разгляду прапановы

Прапанова аб прыватызацыі аб'екта дзяржаўнай уласнасці разглядаецца адпаведным органам прыватызацыі ў месячны тэрмін з дня яе паступлення.

Рашэнне органа прыватызацыі ў тыднёвы тэрмін пасля яго прыняцця ў пісьмовай форме паведамляецца суб'екту, які падаў прапанову на прыватызацыю.

Рашэнне змяшчае згоду, тэрміны і ўмовы правядзення прыватызацыі або матываваную адмову.

Адмова ў прыняцці прапановы на прыватызацыю магчыма толькі ў выпадку, калі ёсць устаноўленыя абмежаванні або забарона на прыватызацыю.

Адмова органа прыватызацыі ў прыняцці прапановы можа быць абскарджана суб'ектам прыватызацыі ў судовым парадку.

Артыкул 16. Камісія па прыватызацыі

Пры станоўчым рашэнні аб прыватызацыі адпаведны орган прыватызацыі стварае камісію па прыватызацыі, якая арганізуе выкананне работ, звязаных з прыватызацыяй, устанаўлівае тэрмін падрыхтоўкі заключэння аб магчымасці прыватызацыі дадзенага аб'екта. Гэты тэрмін не можа перавышаць шасці месяцаў з моманту падачы прапановы.

У склад камісіі ўваходзяць прадстаўнікі органаў прыватызацыі, падатковай інспекцыі, адміністрацыі, прадстаўнікі працоўнага калектыву (у выпадку прыватызацыі прадпрыемства працоўным калектывам).

Камісія па прыватызацыі:

вызначае кошт аб'екта;

пры прыватызацыі прадпрыемства выяўляе яго дэбітораў і крэдытораў і прымае меры для разлікаў з імі;

прымае рашэнне аб умовах уключэння ў склад маёмасці, што прыватызуецца, аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, якія знаходзяцца на балансе прадпрыемства;

робіць заключэнне аб магчымасці прыватызацыі аб'екта;

знаёміцца з любымі дакументамі, якія датычацца дзейнасці аб'екта;

пры неабходнасці патрабуе пісьмовыя тлумачэнні ад службовых асоб і спецыялістаў;

праводзіць рэвізію і інвентарызацыю.

З моманту стварэння камісія мае права адмяняць любыя рашэнні органаў кіравання аб'екта, што прыватызуецца, якія выклікаюць змяненні складу і ацэнку яго маёмасці. Прадпісанні камісіі абавязковыя для выканання органамі кіравання аб'екта. Спрэчныя пытанні, якія вынікаюць з гэтых дзеянняў, вырашаюцца ў судзе.

Камісія мае права прыцягваць да дзейнасці спецыялістаў, экспертаў, іншыя арганізацыі.

Старшынёй камісіі назначаецца прадстаўнік органаў прыватызацыі. Камісія дае заключэнне па прыватызацыі аб'екта. Члены камісіі нясуць персанальную адказнасць за аб'ектыўнасць матэрыялаў, падрыхтаваных для прыняцця рашэння аб прыватызацыі аб'екта.

Камісія спыняе работу пры выключэнні аб'екта з пераліку дзяржаўных аб'ектаў, якія падлягаюць прыватызацыі, або пасля завяршэння яго прыватызацыі.

Артыкул 17. Прыняцце рашэння аб прыватызацыі

На падставе заключэння камісіі орган прыватызацыі:

прымае канчатковае рашэнне аб прыватызацыі дзяржаўнага аб'екта;

уносіць змяненні ў пералік аб'ектаў, якія намячаюцца да прыватызацыі;

прымае рашэнне аб ацэначным кошце аб'екта, які прыватызуецца, аб канчатковых тэрміне і ўмовах продажу (конкурсу);

рыхтуе інфармацыю аб кожным аб'екце, які прапануецца да прыватызацыі, для яе апублікавання.

Артыкул 18. Інфармацыя аб прыватызацыі

Пасля зацвярджэння праграмы прыватызацыі не пазней чым праз месяц у спецыяльным рэспубліканскім інфармацыйным бюлетэні і органах мясцовага друку павінен быць апублікаваны пералік аб'ектаў, якія прапаноўваюцца да прыватызацыі.

У пераліку ўказваюцца:

поўная і скарочаная назва аб'екта;

яго адрас;

орган, які ажыццяўляе прыватызацыю дадзенага аб'екта, і яго месцазнаходжанне;

тэрміны прыватызацыі, якія плануюцца;

тэрміны прад'яўлення прэтэнзій да аб'екта, які прыватызуецца;

кошт маёмасці;

пералік асноўных фондаў па групах;

плошча зямельнага ўчастка і характарыстыкі размешчаных на ім будынкаў, умовы іх арэнды або продажу;

пачатыя інвестыцыйныя праекты, іх каштарысная вартасць і зробленыя па іх затраты;

умовы продажу, у тым ліку па далейшаму выкарыстанню аб'екта.

Пры прыватызацыі прадпрыемстваў падлягаюць апублікаванню дадаткова наступныя звесткі:

колькасць працуючых і іх кваліфікацыйны склад;

фінансавы стан з улікам магчымасці пагашэння крэдыторскай і дэбіторскай запазычанасцей;

наяўнасць долей (паёў, акцый), якія належаць прадпрыемству, у актывах іншых прадпрыемстваў;

нематэрыяльныя каштоўнасці (патэнты, гандлёвыя знакі і іншыя);

абавязацельствы прадпрыемства;

баланс прадпрыемства за папярэдні год;

узбуйненая наменклатура прадукцыі, якая выпускаецца;

іншыя звесткі, якія вызначаюцца органам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю.

Адпаведны орган прыватызацыі ажыццяўляе публікацыю інфармацыі і нясе адказнасць за дакладнасць апублікаваных даных.

У месячны тэрмін з моманту апублікавання інфармацыі асобы, якія жадаюць набыць аб'екты, што прыватызуюцца, павінны падаць заяву ў орган прыватызацыі, які апублікаваў дадзеную інфармацыю. Асобы, якія не падалі своечасова заяву, да прыватызацыі дадзенага аб'екта не дапускаюцца.

Артыкул 19. Выбар умоў і правіл продажу аб'екта (конкурсу, аўкцыёну)

Орган прыватызацыі вольны ў выбары ўмоў і правіл правядзення продажу аб'екта (конкурсу, аўкцыёну). Пры гэтым орган прыватызацыі не можа адхіляць ад удзелу ў конкурсе, аўкцыёне суб'ектаў прыватызацыі, якія своечасова падалі заяву на набыццё аб'екта.

Для прыватызацыі аб'ектаў, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, у выпадках прыватызацыі замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі або асобамі без грамадзянства органы прыватызацыі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў абавязаны атрымаць дазвол органа Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю.

Артыкул 20. Аплата аб'екта, які прыватызуецца

Аплата аб'екта, які прыватызуецца, можа праводзіцца аднаразова або ў растэрміноўку плацяжоў з улікам інфляцыі на ўмовах дагавора.

Для аплаты за набыццё аб'екта нароўне з грашовымі сродкамі выкарыстоўваюцца імянныя прыватызацыйныя чэкі.

Пры набыцці маёмасці, якая прыватызуецца, на перыяд бязвыплатнай прыватызацыі пры любых умовах прыватызацыі (выкуп, аўкцыён, конкурс) 50 працэнтаў ацэначнага кошту аб'екта, які прыватызуецца, аплачваецца імяннымі прыватызацыйнымі чэкамі па іх намінальнаму кошту з улікам індэксацыі.

Артыкул 21. Парадак афармлення здзелак пры прыватызацыі

Заключаная здзелка па набыццю аб'екта, які прыватызуецца, афармляецца дагаворам паміж органам прыватызацыі і новым уласнікам (суб'ектам прыватызацыі) у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дагавор вызначае:

парадак і тэрміны перадачы аб'екта;

форму і тэрміны плацяжу;

узаемныя абавязацельствы бакоў па далейшаму выкарыстанню аб'екта;

іншыя ўмовы, якія ўстанаўліваюцца па пагадненню бакоў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, якія знаходзіліся на балансе дзяржаўнага прадпрыемства, што прыватызуецца, могуць быць перададзены новаму ўласніку гэтага прадпрыемства бязвыплатна без права распараджэння з умовай гарантыі захавання іх мэтавага выкарыстання па дагавору з органам, які кіруе адпаведнай дзяржаўнай маёмасцю.

Дагавор пасля яго падпісання на працягу 10 дзён павінен быць зарэгістраваны ў адпаведным органе прыватызацыі.

Артыкул 22. Афармленне права ўласнасці

Правы валодання і карыстання пераходзяць да новага ўласніка пасля рэгістрацыі дагавора. Правы распараджэння аб'ектам настае з моманту выдачы пасведчання.

Пасведчанне аб праве ўласнасці выдаецца органам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю пры прыватызацыі аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці і выканаўчым камітэтам мясцовага Савета народных дэпутатаў па аб'ектах уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў на працягу месяца пасля ўнясення плацяжу ў адпаведнасці з дагаворам і прадстаўлення неабходных дакументаў.

Прыватызаванае прадпрыемства падлягае рэгістрацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь як наваствoранае. У назве прадпрыемства павінны быць выключаны тэрміны, якія ўказваюць яго дзяржаўную і ведамасную прыналежнасць.

РАЗДЗЕЛ V. ГАРАНТЫІ І АДКАЗНАСЦЬ

Артыкул 23. Гарантыі работнікам дзяржаўных прадпрыемстваў, якія прыватызуюцца

Юрыдычныя асобы, утвораныя працоўнымі калектывамі, якія ўдзельнічаюць у прыватызацыі сваіх прадпрыемстваў, набываюць іх па цане на 20 працэнтаў менш ад сумы, што падлягае аплаце грашамі.

Калі дзяржаўнае прадпрыемства, якое прыватызуецца, набыта юрыдычнай або фізічнай асобай, то новы ўласнік абавязаны ў тэрміны, агавораныя ў дагаворы, па патрабаванню членаў працоўнага калектыву выкупіць па намінальнаму кошту з улікам індэксацыі іх імянныя прыватызацыйныя чэкі, атрыманыя бязвыплатна, або прапанаваць ім адпаведную долю ва ўласнасці прадпрыемства.

Падрыхтоўка і ажыццяўленне прыватызацыі не могуць быць падставай прыпынення дзейнасці прадпрыемства.

Па абавязацельствах, якія вынікаюць з працоўных адносін, да завяршэння прыватызацыі адказнасць нясе дзяржава.

З моманту завяршэння прыватызацыі гэтыя абавязацельствы пераходзяць да новага ўласніка.

Пасля прыватызацыі дзяржаўнага прадпрыемства члены працоўнага калектыву атрымліваюць права ў кіраванні прадпрыемствам у адпаведнасці з доляй уласнасці, якая належыць ім.

Артыкул 24. Гарантыі ўласніку прыватызаванага аб'екта

Дзяржава гарантуе абарону правоў уласніка аб'екта, якія вынікаюць з дагавора аб набыцці прыватызаванага дзяржаўнага аб'екта.

Уласнік прыватызаванага дзяржаўнага аб'екта не нясе адказнасці па даўгах, прэтэнзіі па якіх не прад'яўлены ў тэрміны, устаноўленыя органам прыватызацыі, і не апублікаваны ў адпаведнасці з артыкулам 18 гэтага Закона.

РАЗДЗЕЛ VI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 25. Несапраўднасць здзелак па прыватызацыі

Здзелкі па прыватызацыі дзяржаўных аб'ектаў, заключаныя з парушэннем гэтага Закона пасля ўвядзення яго ў дзеянне, прызнаюцца несапраўднымі з моманту іх заключэння.

Спрэчкі аб прызнанні несапраўднымі здзелак разглядаюцца ў судовым парадку па іскаx зацікаўленых бакоў, органаў прыватызацыі, пракуратуры.

Артыкул 26. Адказнасць за парушэнне гэтага Закона

Асобы, якія сваімі незаконнымі дзеяннямі садзейнічалі заключэнню здзелак у парушэнне гэтага Закона, нясуць крымінальную і адміністрацыйную адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Асобы, вінаватыя ва ўчыненні такіх дзеянняў, пакрываюць пацярпеўшым страты ў поўным аб'ёме.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

19 студзеня 1993 г.
г.Мінск.
№2103-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь" з дня яго апублікавання.

2. Устанавіць, што:

прыватызацыі падлягае маёмасць Рэспублікі Беларусь і адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў;

бязвыплатна ў размеры квот, якія прыпадаюць на кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, перадаюцца 50 працэнтаў маёмасці аб'ектаў, што прыватызуюцца.

3. Устанавіць, што да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь" прымяняецца дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь пастолькі, паколькі яно не супярэчыць дадзенаму Закону.

4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін падрыхтаваць і ўнесці на разгляд Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

распрацаваць і прадставіць на зацвярджэнне Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Дзяржаўную праграму прыватызацыі на 1993 год;

унесці ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапанову па пераліку прадпрыемстваў (аб'яднанняў), арганізацый і відаў маёмасці, якія не падлягаюць раздзяржаўленню і прыватызацыі;

прывесці нарматыўныя акты Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь";

забяспечыць перагляд міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь іх нарматыўных актаў;

распрацаваць і зацвердзіць праграму прыватызацыі дзяржаўных аб'ектаў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, на 1993 год;

распрацаваць і зацвердзіць палажэнні аб ацэнцы аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці, аб камісіях па прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, аб аўкцыёнах і конкурсах па набыццю аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці, аб пакрыцці затрат, звязаных з работай камісіі па прыватызацыі, тыпавы дагавор паміж органам прыватызацыі і новым уласнікам і іншыя;

распрацаваць і зацвердзіць палажэнні аб спецыялізаваных інвестыцыйных фондах;

забяспечыць распрацоўку і прыняцце нарматыўных актаў, неабходных для выпуску, выдачы, абарачэння і пагашэння імянных прыватызацыйных чэкаў.

5. Мясцовым Саветам народных дэпутатаў:

распрацаваць і зацвердзіць да 1 красавіка 1993 года праграмы прыватызацыі аб'ектаў, што знаходзяцца ва ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў;

вызначыць крыніцы фінансавання работ па прыватызацыі, распрацаваць і зацвердзіць палажэнне аб органах прыватызацыі ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў.

6. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін вызначыць крыніцы фінансавання работ па прыватызацыі. Сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь распрацаваць парадак утварэння і выкарыстання сродкаў ад прыватызацыі і ўнесці яго на разгляд Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

7. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь у месячны тэрмін унесці ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб памерах і парадку збірання пошлін за паслугі, звязаныя з прыватызацыяй.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

19 студзеня 1993 г.
г.Мінск.
№2104-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб праекце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Канстытуцыйнай камісіі і яе рабочай групе дапрацаваць праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з улікам прапаноў і заўваг, выказаных народнымі дэпутатамі Рэспублікі Беларусь, і замацаваць у ім наступныя асноўныя палажэнні:

а) дзяржава грунтуецца на прынцыпе раздзялення ўлад;

б) вышэйшы орган дзяржаўнай улады — Вярхоўны Савет, частка дэпутатаў якога можа працаваць на пастаяннай аснове, а другая сумяшчае дэпутацкія абавязкі з вытворчай ці службовай дзейнасцю.

Беларусь — прэзідэнцкая рэспубліка, у якой прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком выканаўчай улады;

в) пяцігадовы тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь;

г) мясцовае самакіраванне ажыццяўляецца грамадзянамі праз мясцовыя прадстаўнічыя органы, мясцовыя рэферэндумы, сходы грамадзян і іншыя формы прамога ўдзелу насельніцтва ў грамадскіх справах у межах кампетэнцыі, прадастаўленай ім законам;

д) паўнамоцтвы органаў мясцовага самакіравання ў вызначэнні сваёй унутранай арганізацыі і стварэння выканаўчых органаў устанаўліваюцца законам;

е) дзяржаўныя гарантыі ўсім грамадзянам роўных правоў для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, акрамя забароненай законам, а таксама стварэння аднолькавых умоў для развіцця ўсіх форм уласнасці;

ж) даступнасць бясплатнага медыцынскага абслугоўвання і атрымання бясплатнай адукацыі ў дзяржаўных установах.

2. Канстытуцыйнай камісіі:

дэталёва вывучыць прапановы па забеспячэнню дзяржавай сацыяльнай абароненасці грамадзян;

пры неабходнасці вызначыць найбольш прынцыповыя пытанні праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія могуць быць вынесены на рэспубліканскі рэферэндум; адпаведныя прапановы ўнесці на разгляд Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

3. Зацвердзіць Парадак завяршэння работы над праектам новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

5 лютага 1993 г.
г. Мінск
№2176-XII

Зацверджаны Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5 лютага 1993 года

Парадак завяршэння работы над праектам новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

1. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе паартыкульны разгляд новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на вясенняй сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у 1993 годзе.

2. Папраўкі да праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і асобных яе артыкулаў уносяцца ў пісьмовым выглядзе старшыні Канстытуцыйнай камісіі асобамі і органамі, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы, не пазней чым за 30 дзён да вызначанай даты разгляду праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Яны павінны быць сфармуляваны ў выглядзе рэдакцыі адпаведных артыкулаў праекта і абгрунтаваны іх аўтарамі.

3. Заўвагі і прапановы абагульняюцца рабочай групай Канстытуцыйнай камісіі. Па заўвагах і прапановах органаў і асоб, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы, складаецца тлумачальная запіска, якая прыкладаецца да праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, што рассылаецца народным дэпутатам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Часовым рэгламентам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Заўвагі і прапановы, загадзя не прадстаўленыя ў Канстытуцыйную камісію, на сесіі не разглядаюцца.

4. Пры абмеркаванні заўваг і прапаноў на пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі павінны быць заслуханы прадстаўнік рабочай групы (эксперт), аўтар, а таксама па два члены Канстытуцыйнай камісіі, якія выступаюць адпаведна "за" і "супраць" папраўкі.

Заўвагі і прапановы асоб і органаў, валодаючых правам заканадаўчай ініцыятывы, якія не падтрыманы Канстытуцыйнай камісіяй, на разгляд сесіі ўносяцца ў абагульненым выглядзе з тлумачальнай запіскай.

5. Праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дапрацаваны з улікам прапаноў і заўваг, выносіцца Канстытуцыйнай камісіяй на разгляд Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне Канстытуцыйнай камісіі прымаецца большасцю галасоў ад агульнай колькасці яе членаў. Пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі правамоцнае, калі на ім прысутнічае больш паловы асоб, якія ўваходзяць у яе склад.

6. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь праводзіць паартыкульнае абмеркаванне праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і галасаванне па праекту Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь або па яго рашэнню — па главах і раздзелах.

7. У выпадку неабходнасці члены Канстытуцыйнай камісіі і яе рабочай групы могуць выступаць на сесіі з адказамі на пытанні народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь. Пытанні па праекту Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь задаюцца ў пісьмовым выглядзе.

8. Па рашэнню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь да правядзення галасавання па праекту Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь цалкам ён накіроўваецца ў Канстытуцыйную камісію для праверкі на адсутнасць унутраных супярэчнасцей і правільнасць узаемасувязей яго артыкулаў.

9. Пытанні, якія не ўрэгуляваны дадзеным Парадкам, вырашаюцца ў адпаведнасці з Часовым рэгламентам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

У артыкуле 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 1979 года "Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь" (ЗЗ БССР, 1979 г., N 18, арт. 296; Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 6, арт. 98, арт. 104) словы "Міністэрства транспарту" замяніць словамі "Міністэрства транспарту і камунікацый".

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

5 лютага 1993 г.
г.Мінск.№2173-XII

ЗАМЕЖЖА

• ІТАР-ТАСС • НАРОДНАЯ ГАЗЕТА •

Пульс дня

Назарбаеў зрабіў кароткі прыпынак. У Анкары

"Адносіны паміж Казахстанам і Турцыяй хутка развіваюцца", — заявіў прэм'ер-міністр Турцыі Сулейман Дэмірэль на сустрэчы з прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым, які зрабіў кароткі прыпынак у Анкары па шляху з Егіпта на радзіму.

С.Дэмірэль і Н.Назарбаеў правялі перамовы, у ходзе якіх закраналіся пытанні, што датычаць развіцця двухбаковых сувязей.

Амерыканцы заваёўваюць расійскі рынак

Амерыканскія карпарацыі працягваюць лідзіраваць сярод замежных фірм, якія зацвярджаюцца ў Расіі, ва ўсялякім выпадку ў колькасных адносінах, паведаміла газета "Крысчэн Саенс Манітор" са спасылкай на міністэрства гандлю ЗША.

Тры гады назад, указвае яна, налічвалася толькі прыкладна 35—40 кампаній, якія базіруюцца ў Злучаных Штатах, якія мелі "плацдармы" таксама на расійскай зямлі. Цяпер іх каля 300.

Харватыя ставіць свае ўмовы

Харвацкі ўрад пагодзіцца прадоўжыць знаходжанне сіл ААН на сваёй тэрыторыі толькі пры ўмове, калі іх дзейнасць будзе накіравана на аднаўленне дзяржаўнай улады Харватыі на ўсёй яе тэрыторыі.

Такое патрабаванне ўтрымліваецца ў пісьме пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Харватыя пры ААН Марыо Нобіла, распаўсюджаным у штаб-кватэры ААН у якасці дакумента Савета Бяспекі.

Сальда становіцца ўсё больш станоўчым

Чарговы прыступ рэзкай крытыкі ў адрас Японіі з боку ЗША і іншых яе буйнейшых гандлёвых партнёраў пагражае выклікаць абнародаваныя міністэрствам фінансаў Японіі даных аб знешнегандлёвым балансе краіны на студзень гэтага года.

Станоўчае сальда знешнегандлёвага балансу Японіі вырасла ў мінулым месяцы ў параўнанні са студзенем 1991 года на 39,4 працэнта, склаўшы ў абсалютным выражэнні 5,29 млрд. долараў — рэкордна высокі паказчык за ўсю пасляваенную гісторыю краіны.

Пра лёс расіян кажуць у ААН

Для Расіі не абыякавы лёс мільёнаў расіян, якія апынуліся з прычыны распаду Савецкага Саюза жыхарамі іншых дзяржаў.

Заклапочанасць выклікае, у прыватнасці, іх становішча ў Латвійскай Рэспубліцы і Эстонскай Рэспубліцы, заявіў на 49-й сесіі камісіі ААН па правах чалавека прадстаўнік Расіі Вячаслаў Бахмін.

У нашых суседзяў

Літва стварыла сабе куміра

Днямі ў суседняй Літве ўпершыню за 600-гадовую гісторыю гэтай дзяржавы адбыліся ўсенародныя выбары прэзідэнта рэспублікі. Адметна, што разам з латвійскімі, шведскімі, польскімі, італьянскімі, малдаўскімі і турэцкімі назіральнікамі за ходам выбараў кіраўніка Літоўскай Рэспублікі сачылі і прадстаўнікі Беларусі: парламентарыі Іван Авін, Уладзімір Новік і Франц Мінько.

Аглядальнік "Народнай газеты" сустрэўся з народным дэпутатам Уладзімірам Новікам і папрасіў падзяліцца сваімі ўражаннямі аб гэтай гістарычнай падзеі.

— Уладзімір Уладзіміравіч, найперш хацелася б даведацца, ці не было парушэнняў закона падчас выбараў першага прэзідэнта Літвы?

— Разам з прадстаўніком Літоўскага Сойма мы аб'ехалі ўсе памежныя з Беларуссю раёны і нідзе не заўважылі парушэння працэдуры выбараў. Нас вельмі здзівіла надзвычайная актыўнасць грамадзян Літвы, адчувалася, што людзі занепакоены лёсам дзяржавы і звязваюць свае надзеі на лепшае жыццё менавіта з новым прэзідэнтам. Вось толькі, як выявілася, не кожны з 2 мільёнаў 600 тысяч маючых права голасу грамадзян Літвы змог прыняць удзел у выбарах, прычым пазбавіліся такога права нават некаторыя з тых, хто прыйшоў на выбарчы ўчастак.

— Чаму?

— Справа ў тым, што зараз у Літве праводзіцца абмен савецкіх пашпартоў на нацыянальныя і пэўная група людзей, здаўшы "малаткаста-сярпасты", не змагла атрымаць новы пашпарт. Таму на выбарчых участках гэтым людзям без пашпарта, сярод якіх пераважную большасць складалі вясковыя дзяды і бабулі, адмаўлялі ў выдачы бюлетэняў. Не ведаю дакладна, колькі чалавек было такім чынам пазбаўлена права голасу (прычым без парушэння закона), але адно магу сказаць з упэўненасцю: падобная акалічнасць даражэй абышлася Бразаўскасу. Увогуле, як мы заўважылі, сярод беларусаў, што жывуць у Літве, ды і самых літоўцаў Альгірдас Бразаўскас намнога больш папулярны, чым яго сапернік. Людзям імпануе палітычная разважлівасць і памяркоўнасць Бразаўскаса, яго прагматычны падыход да пытання аб супрацоўніцтве з краінамі СНД. Я мяркую, што ў бліжэйшы час Літва будзе прысутнічаць на самітах кіраўнікоў краін Садружнасці ў якасці назіральніка, бо за перыяд праўлення Ландсбергіса большасць жыхароў рэспублікі, здаецца, зразумела, што на Захадзе іх праблемы мала каго хвалююць, трэба зноў паварочвацца на Усход, наладжваць былыя гаспадарчыя сувязі. Эканамічная неабачлівасць былога кіраўніцтва рэспублікі прывяла да рэзкага спаду вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, да энергетычнага голаду. Зараз у Вільнюсе спынена падача цяпла ў кватэры, цёплая вада з"яўляецца толькі на вялікія святы. Безумоўна, такое жыццё не можа задавальняць людзей, ім патрэбен кіраўнік, які стаў бы гарантам стабільнасці. Мне здаецца, Альгірдас Бразаўскас на гэту пасаду больш падыходзіць, чым Стасіс Лазарайціс. І не толькі таму, што Дэмакратычная партыя працы, якую ўзначальвае Бразаўскас, мае ў Сойме 71 месца, фракцыя "Саюдзіса" — усяго 16. Сама асоба Бразаўскаса як чалавека, што ўсё жыццё пражыў разам са сваім народам і нямала зрабіў дзеля дабрабыту Літвы, выклікае ў жыхароў рэспублікі нейкую асабліва шчырую павагу і давер. Гэта адчувалася ў размовах з карэннымі літоўцамі, тамтэйшымі беларусамі, палякамі, рускімі. А вось Лазарайціс, нягледзячы на даволі вялікі аўтарытэт сярод літоўскай эміграцыі, дзе ён нарадзіўся і пражыў большую частку свайго жыцця, мне здаецца, для большасці грамадзян Літвы застаецца чужым. Ён, дарэчы, да гэтай пары не мае пастаяннай кватэры ў Літве, жыве ў гатэлі.

— Уладзімір Уладзіміравіч, а вы асабіста падчас знаходжання ў Літве не прыйшлі да высновы, што і нам патрэбен прэзідэнт?

—Так, усенародна абраны прэзідэнт як гарант стабільнасці нам, магчыма, патрэбен. Але гэта павінен быць бясспрэчны палітычны лідэр, сапраўдны народны кумір. Такога палітыка на Беларусі я пакуль што не бачу. Ды гэта і не дзіўна. У нас, у адрозненне ад Літвы, грамадства, на жаль, не такое нацыянальна свядомае, маладыя дэмакратычныя партыі не маюць пад сабой трывалай сацыяльнай асновы. Калі гэта ўсё з"явіцца, то, я ўпэўнены, беларусы таксама выберуць сабе прэзідэнта, які будзе ставіць інтарэсы нашай дзяржавы вышэй за любыя палітычныя амбіцыі.

Гутарыў Мікола ДЗЯБЕЛА.

Фидель Кастро верен своим идеям

Кубинский руководитель Фидель Кастро обвинил Соединенные Штаты в том, что, ужесточая экономическую блокаду Кубы, они пытаются заставить кубинцев "сдаться из-за голода и болезней".

Выступая в Сантьяго-де-Куба перед кандидатами в депутаты провинциальных ассамблей народной власти и парламента, он выразил уверенность в том, что антикубинская политика США не заставит республику отказаться от борьбы за свою независимость и от системы социальной справедливости, созданной после революции.

Сергей СЕРЕДА.

Эўрыка!

Плуг супраць... радыяцыі

Вядома, наколькі небяспечна займацца земляробствам у чарнобыльскай зоне. Гэтай праблемай зацікавіўся дацкі вучоны І.Радам і сканструяваў спецыяльны плуг, які здымае верхні слой глебы (3—10 сантыметраў) і закопвае яе на глыбіню да 45 см. Пры гэтым не парушаецца структура прамежкавага ізаляванага слою. Плуг праходзіць кожную раллю двойчы: спачатку пракладвае саму раллю, а потым зразае верхні слой з суседняй паласы, пераносіць яго на дно і зрушвае глебу ўбок...

Пратэз-аўтамат

У Японіі з'явіўся пратэз, у якім мікрапрацэсар забяспечвае аўтаматычнае рэгуляванне пнеўматычнай кампрэсіі ў залежнасці ад тэмпу хадзьбы інваліда і ён не кульгае. У новым пратэзе запраграміравана таксама пяць "хуткасцей". Спецыяльны механізм вымярае тэмп згінання нагі, а клапан рэгулюе ціск у пнеўмацыліндры.

СВЕТ В ОКНЕ

ВЫПУСК 4 (50)

Армейские были

Наблюдательный солдат Злодеев

Дмитрий МАКОВИН

В 1951 году я служил в Группе советских оккупационных войск в Германии — было такое объединение...

На политзанятиях проводилось обсуждение фильма "1919-й год". Был там такой эпизод: успешно проведя бой под Царицыном, Сталин, находясь на наблюдательном пункте, сказал примерно следующее: "Вот, а сейчас и подкрепиться можно". И начал есть кашу из солдатского котелка.

Замполит капитан Зайцев, проводивший политзанятия, с удовольствием отмечал эпизод с кашей.

Вдруг поднялся рядовой Злодеев:

— Товарищ капитан! Неужели это все правда, что показывают в кино про товарища Сталина?

Замполит начал бледнеть... А Злодеев продолжал:

— Возьмите картину "Падение Берлина". Там показано, как в конце войны товарищ Сталин прилетает в Берлин и на аэродроме целуется с нашей русской девушкой, которая была в немецкой неволе. Она — помните? — сама полезла целоваться. Ну, разве это допустимо? А вдруг она больная какая? И товарищ Сталин мог бы заразиться через поцелуй...

Замполит сидел бледный, окаменевший. Наконец, он разжал зубы и выдавил из себя:

— Ну и скажешь ты, Злодеев. Это же кино. Не принимай за чистую монету все, что там показывают.

— Так вот я и не принимаю, — откровенно сказал солдат.

Імгненне і вечнасць

Советы бывалого человека

Вы покупаете водочку...

Теперь продается большое количество самых разных спиртных напитков. Некоторые из них изготовлены нелегально, сомнительного качества. Как определить, например, фальсифицированная перед вами водка или нет. Вот несколько советов...

У настоящей водки на этикетке с обратной стороны должен быть штамп с цифрами и клей нанесен ровными полосами.

На пробке у подлинного продукта — с боков три характерные выемки от фабричного зажима. У подпольных цеховиков такой отметины нет.

Можно определить происхождение водки, плюнув на собственную ладонь и покрутив по ней донышком бутылки. Остался на руке черный круг — ясно, что она прошла через заводской конвейер. Нет — возникают сомнения.

Сделайте поллитровкой несколько интенсивных вращательных движений. Образовавшийся в ней "столб" из воздушных пузырьков в фальсификате рассасывается быстро, а в "монопольке" стоит довольно долго.

Советует Владислав ТИМОФЕЕНКО, ветеран войны, ветеран труда, ветеран комсомола, ветеран борьбы с алкоголизмом.

Рисунок Олега ПОПОВА.

О чем свидетельствует мировая практика

Что такое рыночная экономика

Посольство США в Республике Беларусь и Информационная служба США (ЮСИС) любезно предоставили "Народной газете" серию материалов под общим названием "Что такое рыночная экономика". Надеемся, они представят интерес для читателей нашего издания.

На протяжении всей истории каждое общество сталкивалось с основополагающей экономической проблемой: что и для кого производить в мире ограниченных ресурсов. В 20-м веке две конкурирующие экономические системы (в широком смысле этого слова) — командная экономика, управляемая централизованным правительством, и рыночная экономика, основанная на частном предпринимательстве, — дали два совершенно различных ответа на этот вопрос. Сегодня, в последнем десятилетии 20-го века, совершенно ясно, что централизованная, командная экономическая модель, в какой бы части света она ни устанавливалась, не смогла поддержать устойчивый экономический рост, достигнуть какого-то уровня процветания или даже просто создать для своих граждан экономическую обеспеченность.

И все же, несмотря на наглядный успех рыночной экономики в различных обществах — от Западной Европы до Северной Америки и Азии, основополагающие принципы и механизмы этой альтернативной экономической системы для многих остаются неизвестными или непонятыми. Происходит это частично потому, что рыночная экономика — не идеология, а комплекс проверенных временем методов и установлений, направленных на то, чтобы отдельные личности и общества жили в условиях экономического процветания. Рыночная экономика по самой своей природе является децентрализованной, гибкой, практичной и изменяемой. Центральным для нее является тот факт, что она лишена центра. Недаром "невидимая рука" стала метафорой, наиболее образно определяющей сущность частного рынка.

Рыночная экономика может быть практичной, но она зиждется на фундаментальном принципе личной свободы: свободы потребителя выбирать из многих конкурирующих продуктов и видов услуг; свободы производителя открыть или расширить дело и таким образом взять на себя связанный с этим риск и получить вознаграждение в случае успеха; свободы работника выбрать себе работу или карьеру, вступить в профсоюз или переходить от одного работодателя к другому. Именно это утверждение свободы, риска и возможностей объединяет современную рыночную экономику с политической демократией. Рыночная экономика не свободна от несправедливостей и злоупотреблений — порой достаточно серьезных, — но нельзя тем не менее отрицать, что современное частное предпринимательство и предпринимательский дух, вкупе с политической демократией, предлагают самые лучшие перспективы для сохранения свободы и самые широкие возможности для экономического роста и процветания для всех людей.

Командная и рыночная экономика

Такие продукты, как хлеб, мясо, одежда, холодильники, жилье, производятся и продаются сегодня практически в любой стране мира. Производственные методы и ресурсы, используемые для создания этих продуктов, часто очень схожи в разных странах — хлеб, например, печет булочник, используя для этого муку и воду, а часто также соль, сахар и дрожжи. Когда хлеб вынут из печи, буханки продаются потребителям в магазинах, которые могут быть очень похожи друг на друга, хотя бы внешне, в странах с различными экономическими системами.

Командные решения по поводу одежды

Несмотря на это очевидное сходство, если мы сравним рыночную экономику стран Северной Америки, Западной Европы и Японии с командной экономикой бывшего Советского Союза, стран Восточной Европы и некоторых стран Азии на протяжении прошедших пятидесяти лет, то увидим, как резко различаются между собой процессы, используемые для определения того, какая продукция должна быть произведена, каким образом, какова должна быть ее цена и кто станет ее потребителем. Чтобы более наглядно увидеть эти различия, рассмотрим процесс принятия решений о производстве и сбыте какого-то одного вида продукции — скажем, рубашек и блузок — в условиях этих двух экономических систем.

В командной экономике правительственные комитеты по экономическому планированию, эксперты по вопросам производства и политические должностные лица устанавливают уровни производства для этих товаров и определяют фабрики, которые будут их выпускать. Центральные планирующие органы также устанавливают цены на рубашки и блузки и заработную плату производящим их рабочим. Этот комплекс централизованных решений определяет количество, разнообразие и цены на предметы одежды и на другие продукты.

Нетрудно предвидеть, что этот ограниченный выбор товаров быстро распродается и исчезает с прилавков. Почему? Потому что либо фабрики не смогли выполнить установленную для них производственную норму, либо центральные плановые органы недооценили, какое количество рубашек люди захотят купить по установленной ими цене. В любом случае, если плановики не примут меры для увеличения производства или повышения цен, или того и иного вместе, дефицит товаров не исчезнет.

По мере роста населения в странах с командной экономикой, а также увеличения числа новых продуктов и их усложнения центральным плановым органам становится все труднее избежать дефицита многих продуктов, которые потребители хотят купить, или избытка тех, которых они не хотят. Растет число продуктов и людей, изменяются производственные технологии, и центральные планирующие органы оказываются перед необходимостью принимать гигантское количество решений, а вместе с тем чудовищно увеличивается вероятность того, что в ряде мест что-то может не сработать, подвергая тем самым опасности выполнение общего плана национальной экономики.

Такое явление невозможно в условиях рыночной экономики, поскольку эта система функционирует совершенно иным способом.

Начнем с того, что не существует министерства, решающего, какое количество рубашек и блузок должно быть произведено и какого они должны быть цвета и фасона. При рыночной экономике любой человек или компания может принять решение о производстве и продаже рубашек и блузок, и многие так и поступят, если будут считать, что могут продать эту продукцию по цене, достаточно высокой, чтобы покрыть производственные расходы, и заработать на этом виде одежды больше, чем на чем-то другом. Это ведет к прямой конкуренции между разными фирмами, производящими и продающими эту продукцию, а конкуренция и является одной из основных причин разнообразия фасонов, материалов и типов одежды, дающих потребителю в условиях рыночной экономики возможность выбора.

Конечно, если потребители решат покупать лишь один вид рубашек и блузок из месяца в месяц и из года в год, производители скоро поймут, что нет никакого смысла производить другой тип продуктов. Однако в условиях, когда людям предоставляется возможность выбора из большого разнообразия одежды, такое не происходит.

Цена рубашек

Другой ключевой момент, характерный для рыночной экономики, заключается в том, что цены на рубашки и другие продукты, продаваемые в магазинах, не устанавливаются плановыми органами. Каждый продавец свободен повышать или снижать цены в соответствии с изменяющимися рыночными условиями. Например, если в какой-то момент один вид рубашек начинает пользоваться большим спросом и продавцы боятся, что эти рубашки будут раскуплены до того, как они смогут пополнить свои запасы, цена на этот вид рубашек обычно повышается, по крайней мере на то время, пока не приходит новая партия товара. Повышение цены дает возможность достигнуть сразу двух целей: во-первых, если этот вид рубашек станет дороже других видов рубашек или иных товаров, некоторые потребители предпочтут покупать их в меньшем количестве и в большем количестве другие товары; во-вторых, поскольку доход от более высоких цен идет напрямую тем, кто производит и продает рубашки, а не правительству, более высокие цены увеличивают доход фирм, осуществляющих производство и продажу этих рубашек, и позволяет им производить и продавать большее количество единиц. Фирмы, производящие другие виды продукции, также видят, что производители рубашек получают более высокие прибыли, и это стимулирует некоторые фирмы прекратить производство чего-то другого и начать производить рубашки, пользующиеся большим спросом.

Все эти факторы — потребители, покупающие меньшее количество рубашек, производители рубашек, производящие их в большем количестве, и другие фирмы, решающие начать производство этих рубашек, — способствуют тому, что дефицит будет в скором времени преодолен. Заметьте, что принятие всех этих решений происходит без участия центральных плановых органов. На самом деле, процесс происходит быстрее, а в каком-то смысле даже автоматически, именно потому, что решения потребителя и производителя децентрализованы.

Рынки

